Деловая игра полезна тем, что она позволяет ее участникам раскрыть себя, научиться занимать активную позицию, испытать себя на профессиональную пригодность, упражняться в профессиональной компетенции.

1. Роли в игре определяются в соответствии с ее учебными целями.

2. Роли в деловой игре следует распределять с учетом уровня знаний, сформированности навыков и умений владения иностранным языком, личностных качеств обучаемых.

Задание, предваряющее деловую игру, дается для того, чтобы обучаемые могли заблаговременно подготовиться к деловой игре. Оно включает следующие компоненты:

– описание исходных позиций деловой игры;

– организационные указания, перечень ролей.

Цель задания, предваряющего деловую игру на иностранном языке, – психологическая, информационная и языковая подготовка участников игры к правильному выполнению своей роли, вживанию в нее, обдуманному, обоснованному ролевому и речевому поведению в игре, желательному взаимодействию с другими участниками игры.

Особую часть предваряющего задания к деловой игре составляет работа со специальными текстами на иностранном языке; выполнение специальных языковых и речевых упражнений, ориентированных на иноязычное общение в процессе игры, а также работа с материалами для самообучения.

Деловая игра начинается вступительным словом преподавателя, в котором излагается цель всей игры и каждого ее этапа. Преподаватель стимулирует и направляет дискуссию, вводит новую информацию и предлагает новые обстоятельства, формулирует тезисы, делает текущие и окончательные выводы и заключение, дает оценку выводов и мнений участников игры, стимулирует реакцию собеседников, сообщает о своих наблюдениях, поддерживает разные точки зрения, возражает, напоминает, просит что-то уточнить и т. д.

Преподаватель также подводит итоги дискуссии, комментирует и исправляет речевые ошибки. В конце преподаватель дает развернутую итоговую оценку участия в игре каждого из обучаемых, объясняет значение игры для дальнейшей профессиональной деятельности обучаемых.

ЛИТЕРАТУРА

1. Маслыко Е.А. и др. Настольная книга преподавателя иностранного языка. Мн., 1992.

2. Журнал «Иностранные языки в школе». 1996. № 6.

3. Научно-методический журнал «LINGUA». 1996. № 2.

УДК 378. 1:947.6

М.Я. Сяменчык, дацэнт

## АБ НЕКАТОРЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ ТЭХНІЧНЫХ ВНУ Ў КУРСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

In the article some considerations on problems of the students` patriotic upbringing are viewed and some ways of them getting over in the course of teaching the History of Belarus at technical higher schools are proposed.

Апошнім часам, бадай, ні адзін з артыкулаў на тэму фарміравання высокамаральнай асобы, якія з'яўляюцца ў друку, не абыходзіць увагай праблемы патрыятычнага выхавання студэнтаў [1]. Адразу заўважым, што яна, гэтая праблема, уяўляецца актуальнай для ўсіх навучальных устаноў, а не толькі тэхнічных вну. Гаворка пра асаблівасці можа ісці хіба ў рэчышчы яе вырашэння сродкамі і метадамі гістарычнай адукацыі ва ўмовах абмежаванай колькасці аўдыторных гадзін на яе авалоданне; па-другое, пры небагатай навучальна-тэхнічнай базе выкладаемай дысцыпліны; па-трэцяе, пры наяўнасці спецыфічнага складу студэнтцтва (выпускнікоў школ, спецыяльных класаў, гімназій, ліцэяў, зарыентаваных на авалоданне, у асноўным, вытворчымі прафесіямі); па-пятае, калі выкладанне гісторыі Беларусі здзяйсняюць у большасці работнікі рэфармаваных кафедр грамадскіх навук, якім у сілу абставін давялося асвойваць новую для сябе спецыяльнасць.

У астатнім сучасны стан і тэндэнцыі выхавання студэнтаў абумоўлены тоеснымі палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі і іншымі прычынамі. Характэрна, што выкладчыкі гісторыі Беларусі, у тым ліку былыя партыйна-савецкія гісторыкі, добра ўсведамляюць першаступенную ў параўнанні з іншымі прадметамі значнасць сваёй дысцыпліны ў фарміраванні патрыятызму. Іншая справа, што адзіных крытэрыяў у ацэнцы патрыятычнасці не выпрацавана нават флагманамі гістарычнай думкі – БДУ і Інстытутам гісторыі НАН РБ. Мяркуем, што выкладчыкі тых вну, дзе адсутнічаюць гістарычныя факультэты, абапіраючыся на тыпавыя праграмы, маюць пэўную «аператыўную прастору» для таго, каб самастойна вызначыць кампаненты патрыятычнага выхавання і шляхі яго ажыццяўлення. У падмурку гэтай працы – значны вопыт, запазычаны з савецкіх часоў. Як вядома, на працягу доўгіх год змест патрыятычнага і грамадзянскага выхавання моладзі грунтаваўся на класавых падыходах. «На гэтай глебе, – адзначалася ў адной з брашур, – выпрацоўваецца чоткая ацэнка з камуністычных пазіцый нацыянальных асаблівасцяў, каштоўнасцяў, звычаяў, прышчапляецца «імунітэт да чужых марксізму-ленінізму поглядаў»[2]. На ўкараненне тых падыходаў працавала ўся палітычная сістэма, у тым ліку асвета, навука, культура, ідэалогія. Натуральна, што нацыянальны патрыятызм па ідэйна-палітычных меркаваннях не «стыкаваўся» з савецкім, таму і не прапагандаваўся. За той час вырасла не адно пакаленне, у тым ліку большасць цяперашніх выкладчыкаў, у пэўным сэнсе адэптаў старой ідэалогіі.

Крах КПСС прадэманстраваў, акрамя іншага, перавагу агульначалавечых каштоўнасцяў над таталітарнымі, калі пракламаваная «новая гістарычная супольнасць» (савецкі народ) выявіла сваю штучнасць і саступіла месца традыцыйным нацыянальным формам жыццядзейнасці народаў СССР.

З канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў БССР нацыянальнае жыццё таксама ўстала на натуральны шлях. У рэчышчы ўздыму беларускасці вострай праблемы выхавання патрыятызму не існавала, бо яго фарміраванне адбывалася па меры ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці. Але нацыянальны рух на Беларусі быў ацэнены як нацыяналістычны і сустрэў моцнае процідзеянне з боку былой наменклатуры і часткі грамадства, выхаваных у духу таго ж «савецкага патрыятызму» і «пралетарскага (сацыялістычнага) інтэрнацыяналізму». Імкненне пашырыць сферу выкарыстання беларускай мовы таксама стала атаясамлівацца з праявай нацыяналізму.

Выдатныя і своечасовыя, на нашу думку, творы знакамітых педагогаў БДПУ Д.І. Вадзінскага і А.А. Грымаця, якія займаліся тэорыяй каштоўнасных арыентацый моладзі [3], не знайшлі шчырых паслядоўнікаў. Вынікі майскага (1995 г.) Рэферэндуму паказалі незапатрабаванасць «Пагоні», бел-чырвона-белага сцяга і ў той самы час – жа-

данне людзей «ураўнаць у правах» беларускую і рускую мовы. Распрацаваная гісторыкамі АН РБ «Нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі» была адкінута.

Аднак са знішчэннем палітычнай манаполіі КПСС і старой сістэмы камуністычных каштоўнасцяў укараненне новай, на нашу думку, адбываецца з вялікай цяжкасцю. Асноўным недахопам апошняй з'яўляецца эклектызм, апалагетыка каштоўнасцяў сумніўнага паходжання і г. д. Так, «Праграма выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі у Рэспубліцы Беларусь», што як «вынік сумесных пошукаў вялікага калектыву філосафаў, педагогаў, псіхолагаў і сацыёлагаў» выйшла з друку ў 2001 годзе, не лічыць патрыятызм паўнавартай каштоўнасцю і рэкамендуе выхоўваць яго «разам з інтэрнацыяналізмам» [4].

Застаецца толькі здзіўляцца, чаму складальнікамі праграмы пакінуты па-за ўвагай грунтоўны твор свайго калегі – акадэміка НАН РБ Харламава І.Ф., спецыяльная глава якога названа ў адпаведнасці са здаровым сэнсам – «Выхаванне патрыятызму і культуры міжнацыянальных адносін» [5]. Менавіта ў такой звязцы патрыятычнае выхаванне набывае прыярытэтны статус і не губляецца сярод іншых этычных катэгорый.

Такім чынам, прафесійныя распрацоўшчыкі каштоўнасных арыентацый пакуль далёкія ад дзейсных прапаноў па паляпшэнні патрыятычнага выхавання. Іх рэкамендацыі ўяўляюць сабой горшы варыянт адпаведных праграм савецкіх часоў, а між тым карэнныя змены у сацыяльна-эканамічным, палітычным, духоўным жыцці грамадства патрабуюць адпаведных падыходаў у пытаннях выхавання маладога пакалення. Спроба прапаганды асобнымі гісторыкамі ідэі згуртавання беларусаў на аснове агульнаславянскіх каштоўнасцяў, на нашу думку, несвоечасовая, бо на этапе ўмацавання суверэнітэту РБ толькі размывае нетрывалы яшчэ грунт для нацыянальнай кансалідацыі.

Падобныя нюансы трэба мець на ўвазе яшчэ і таму, што з часоў перабудовы новыя падручнікі не пераставалі быць палігонам ідэйных сутыкненняў. Але наколькі яна, гэта гісторыя, можа кансалідаваць грамадства, настолькі і раздзяляць яго. У дадзеным выпадку існуючыя падручнікі «грашаць» сваёй апалагетыкай бальшавізму, адназначным асуджэннем нацыянальнага руху канца 80-х – пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, неаб'ектыўным асвятленнем грамадска-палітычнага жыцця апошніх гадоў. Зразумела, што гісторыя, падзеленая аўтарамі існуючых твораў на «сваіх» і «чужых», не прынясе агульнай карысці. Час палітычнай канфрантацыі мінае, разам з ім павінны адысці «на заслужаны адпачынак» і названыя творы як помнікі гістарычнай думкі постсавецкай эпохі.

Мяркуем, што асноўны крытэрый вартасці курса па гісторыі Беларусі павінен заключацца ў яго здольнасці сканцэнтраваць максімум пацверджаных сучаснай навукай і даступных засваенню матэрыялаў. Пры гэтым у іх аснову павінны быць пакладзены тыя, што адпавядаюць інтарэсам тытульнай нацыі суверэннай краіны, задачам яе кансалідацыі і далейшага развіцця. Акрамя таго, з прычыны абмежаванасці аўдыторных заняткаў узнікае патрэба ў арганізацыі ўмоў для дзейснай самастойнай працы студэнтаў, у прыватнасці забеспячэнне іх дастатковай колькасцю зборнікаў дакументаў, альбомаў ілюстрацый, даведачнай літаратуры, як гэта прынята падчас вывучэння іншых прадметаў.

Неабходнасць гэтага віду працы часам даводзіцца студэнтам тлумачыць, паколькі яны, зарыентаваныя на канкрэтную прафесію, далёкую ад гуманітарнай, не заўсёды разумеюць, навошта, да прыкладу, ім патрэбна паглыбляцца ў падрабязнасці паўстання 1863 г., калі яно ўсё роўна скончылася паражэннем. Відавочна, што спажывецкае стаўленне студэнта да навучання («вывучаю толькі тое, што мне спатрэбіцца ў жыцці»)

можа перарасці ў такое ж стаўленне да грамадства, да Бацькаўшчыны («мая хата з краю», «дзе добра жыць, там і Бацькаўшчына»). Як выкладчыку гісторыі не скарыстаць гэты выпадак і ў вучэбных, і ў выхаваўчых мэтах? Дзе, як не на семінары па гісторыі, мэтазгодна закрануць пытанне аб узрослым імкненні юнакоў ухіліцца ад службы ў войску?

Адна з асаблівасцяў выхаваўчай працы ў тэхнічных вну заключаецца яшчэ і ў тым, што, на думку большасці выкладчыкаў, як правіла спецыялістаў у галіне дакладных навук, яе (гэтай працы) ажыццяўленне павінна адбывацца выключна сіламі «грамадазнаўцаў». Не станем даказваць памылковасці такой пазіцыі і прычын яе з'яўлення. Што датычыць тых самых «грамадазнаўцаў», то, перакананы, яны заўсёды выконвалі і будуць выконваць гэту працу, паколькі выкладанне гісторыі без выхавання высокіх пачуццяў, як правіла, не бывае.

Наогул, асоба творчага выкладчыка гісторыі Беларусі ў тэхнічным вну – той выпадак, калі прымаўка «Добры чалавек – не прафесія» не мае сілы. У час пагалоўнай пісьменнасці дыпламаваны спецыяліст – не дэфіцыт, тут патрэбны не проста выкладчык па пасадзе, а выкладчык «ад бога», здольны пераканаць студэнтаў у тым, у чым упэўнены сам.

Спецыфіка тэхнічных вну выяўляецца таксама ў працы выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін такім чынам, што студэнты ўспрымаюць «практычныя заняткі» па грамадазнаўчых прадметах у літаральным сэнсе, імкнучыся найперш прадэманстраваць валоданне зместам заканспектаваных лекцый. Яны з цяжкасцю могуць абстрагіравацца ад рэчаіснасці, выказаць уласнае бачанне той ці іншай падзеі і г. д. Толькі пад умелым кіраўніцтвам вопытнага выкладчыка семінар (што з блізкага да латыні азначае «расаднік думак») ператвараецца ў дыялог або гутарку, дзе, акрамя вучэбных задач, узнікаюць найбольш спрыяльныя магчымасці для фарміравання ў студэнтаў высокамаральных, у тым ліку патрыятычных, якасцяў.

Спрактыкаваныя выкладчыкі ўсведамляюць, што выхаванне патрыятычных пачуццяў не мэтазгодна здзяйсняць толькі на ваенных эпізодах гісторыі, хоць гэта і найбольш дзейсны момант выхавання. Пры ўмелых падыходах разгляд эканамічнага жыцця нашых продкаў, іх матэрыяльнай культуры можа ўздзейнічаць на пачуцці не менш глыбока. Мяркуем, што ў названым напрамку патрыятычнага выхавання вялікую дапамогу «гісторыкам» могуць аказаць выкладчыкі прыкладных дысцыплін.

Не варта доўга пераконваць у жыццёсцвярджальнай моцы патрыятызму, бо народ, нават страціўшы сваю незалежнасць, як палякі і беларусы пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай, рана ці позна адродзіць яе. Але лепш пра гэта памятаць, чым адчуць на сабе панаванне чужынцаў. У гэтай сувязі дадатковае папярэджанне юнакам-студэнтам перагледзець сваё негатыўнае стаўленне да службы у беларускім войску, каб не зрабіцца рэкрутам у чужым.

Тыя выкладчыкі, хто ставіць узровень патрыятызму грамадзян у залежнасць ад эканамічнага стану іх краіны, магчыма, дзесьці маюць рацыю, але і яна, гэтая краіна, ніколі не зробіцца багатай і магутнай без адпаведнага стаўлення да яе грамадзян. Ізноўтакі, дзе, як не на семінары па гісторыі Беларусі, узяўшы для абмеркавання, скажам, пасляваеннае развіццё БССР, магчыма пераканаць маладых людзей у неабходнасці стваральнай працы на карысць Радзімы. Разам з тым не ўсе нашы ранейшыя «славутыя дасягненні», такія, як удзел беларусаў у асваенні цаліны і БАМа, маюць выхаваўчы патэнцыял. У той самы час бясспрэчна, што тэма Вялікай Айчыннай назаўсёды застанецца актуальнай.

На жаль, амаль кожны год выкладанне важнейшых дысцыплін – гісторыі Беларусі і паліталогіі, якія ў найбольшай ступені фарміруюць патрыятызм і грамадзянскасць, пастаянна скарачаецца. Гэта небяспечная тэндэнцыя не спрыяе ажыццяўленню міністэрскай канцэпцыі выхавання навучэнцаў, новаму закону «Аб адукацыі» і таму павінна быць перасечана на дзяржаўным узроўні. 44 лекцыйных і 28 семінарскіх гадзін, адведзеных на больш ці менш паўнацэннае выкладанне курса гісторыі Беларусі, яўна недастаткова для выканання адукацыйных і выхаваўчых задач. Пры гэтым назіраецца яўная метадычная памылка, калі пытанні культуры Беларусі вылучаны з агульнага курса гісторыі і перададзены выкладчыкам культуралогіі. Мяркуем, што разгляд дасягненняў культуры Беларусі ў культуралагічным і гістарычным кантэкстах дае розны вынік у патрыятычным выхаванні. Пэўна ж, выкладчыкі стараюцца максімальна рацыянальна затраціць час на дыдактычныя і педагагічныя мэты, але ж для таго, каб студэнты сапраўды праніклісяя гісторыяй, патрэбна куды большая, чым цяпер, колькасць гадзін на яе асэнсаванне, толькі тады можа ўзнікнуць своеасаблівая «крытычная маса» ведаў і станоўчых эмоцый, здольная з дапамогай выкладчыкаў уздзейнічаць на розум і сэрцы студэнтаў.

Такім чынам, у фарміраванні патрыятызму ў курсе гісторыі Беларусі мы бачым шэраг праблем, неабходных і магчымых для вырашэння. Але паколькі яны, гэтыя праблемы, існуюць і перад іншымі выкладчыкамі, і ў пэўнай ступені – перад усім грамадствам, то варта вынесці іх для больш прадстаўнічага абмеркавання. У сваёй вучэбна-выхаваўчай дзейнасці работнікі ўсіх вну павінны працаваць у адзіным рытме, выкарыстоўваць дасягненні навукова-педагагічнай думкі. На жаль, ні адзін з тэхнічных вну не ўзяў на сябе клопат наладзіць канферэнцыю гісторыкаў, каб падзяліцца вопытам, у тым ліку патрыятычнага выхавання. Вельмі важна вызначыцца адносна тых каштоўнасных арыенціраў, якіх належыць прытрымлівацца ў далейшай дзейнасці. У прыватнасці, на чым акцэнтаваць выхаваўчае ўздзеянне напярэдадні маючага адбыцца Саюзу Расіі і Беларусі? Нам, напрыклад, здаецца слушным выказванне навуковага супрацоўніка Адміністрацыі Прэзідэнта РБ прафесара С. Лапцёнка аб тым, што «важна ісці не па заходняму або ўсходняму шляху (роўна як і паўночнаму або паўднёваму), а па свайму, гэта значыць аптымальнаму, самабытнаму для сваёй краіны» [6].

Мяркуем таксама, што было б карысным вынесці на шырокае абмеркаванне мэтазгоднасць прапаганды «славянскага брацтва» ва ўмовах умацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, праблему суадносін патрыятызму і нацыяналізму на розных этапах нашай мінуўшчыны. Канструктыўнае абмеркаванне названых пытанняў прынясло б несумненную карысць вывучэння гісторыі Беларусі, а праз яе і ўсяму грамадству, у тым ліку ў патрыятычным выхаванні студэнцтва.

## ЛІТАРАТУРА


1. Бутрим Г. А. Современные приоритеты воспитания студенческой молодежи // Вышэйшая школа. – 2001. – № 1. – С. 9; Русецкий А. В., Гащенко Л. А. Формирование патриотических ценностей в высшей школе // Вышэйшая школа. – 2001. – № 6. – С. 17; Жук О. Л. Организация воспитательной работы в вузе // Праблемы выхавання. – 2002. – № 2. – С. 13.
2. Патриотическое и интернациональное воспитание студентов в социалистическом обществе. М., 1986. – С. 26.
3. Вадзінскі І. Д., Грымаць А. А. Фарміраванне маральных каштоўнасных арыенціраў будучых педагогаў. Мн.: БДПУ, 1993.

4. Праграма выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Мн.: БДТУ, 2001. – С. 72–74.
5. Харламов И. Ф. Педагогика. Мн.: Университетское, 1998. – С. 560.
6. Беларуская думка. – 2002. – № 11–12. – С. 88.

УДК 378.4:331.101.264.2(476)

П.В. Дзядзюля, дацэнт

## РОЛЯ БДТУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАДРАЎ

The BSTU is perfecting its system of educational arrangements on the improvement of training a specialist.

...Толькі тое выхаванне добраахвотнае,
якое абапіраецца на нацыянальныя карані.
К.Д. Ушынскі

Калі з пэўнай доляй умоўнасці ўзяць за ўзор цывілізацыю краін Заходняй Еўропы, то неаспрэчна канстатацыя – выхаваўчыя ідэі кожнага народа прасякнуты найперш нацыянальным.

Стагоддзямі «нацыя», «народ», «дзяржава» з'яўляліся інтэгрыруючымі паняццямі. Не выпадкова Гегель сцвярджаў, што «дзяржава – гэта шэсце Бога ў свеце, яе асновай служыць улада розуму, якая здзяйсняе сябе як волю» [1]. Вядомы нямецкі палітолаг М. Вэбер разглядаў нацыю як палітычную катэгорыю, якая можа быць вызначана толькі ў адносінах да дзяржавы, хаця яна і не раўназначна ёй [2].

На сувязь адраджэння дзяржаўнасці з прагрэсам Беларусі ўказвалі ў XX ст. шматлікія беларускія патрыёты, сапраўдныя інтэлігенты. Напрыклад, вядомы беларускі публіцыст Уладзімір Самойла ў пачатку 20-х гадоў пісаў, што толькі нацыянальная дзяржава дазволіць беларусам заняць належнае месца сярод цывілізаваных народаў, адстаяць права на свабоднае развіццё.

Пазнанне нацыянальнай гісторыі, культуры, характару – важнейшая ўмова ў пошуках аптымальных варыянтаў арыентацыі моладзі Беларусі.

Выхаваўчая работа ва універсітэце павінна быць падпарадкавана фарміванню нацыянальна-свядомага, усебакова развітага, зарыентаванага на творчае засваенне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі, скіраванага на практычную дзейнасць ва ўмовах рыначнай эканомікі спецыяліста. Наш выпускнік павінен ганарыцца тым, што ён грамадзянін незалежнай Беларусі.

Выкладанне прадметаў гуманітарнага цыкла, якое забяспечваюць кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі, беларускай мовы, філасофіі і права, замежных моў, дазваляе ахапіць усе аспекты выхавання маладога чалавека і садзейнічаць стварэнню тэарэтычнай базы выхаваўчай работы са студэнтамі БДТУ.

* * *

Усімі магчымымі сродкамі павышаць аўтарытэт нашага універсітэта, змагацца за свайго абітурыента. Для гэтага неабходна выпусціць шэраг самых разнастайных, прыгожых буклетаў, у якіх адлюстраваць гісторыю БДТУ, яго факультэтаў, кафедр. Даць кароткія, яркія нарысы пра лепшых выкладчыкаў, прасачыць жыццёвыя шляхі таленавітых выкладчыкаў, падабраць карцінкі з жыцця сённяшніх студэнтаў, раскрыць магчымасці нашых спецыялістаў ва ўмовах рыначнай эканомікі і г. д. Падкрэсліць адметнае месца БДТУ сярод вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Еўропы, Расіі, каш-